*ПРАЕКТ*

Зацверджаны ......
пратакол № ад ......

# СТАТУТ
прыватнай установы адукацыі
"УНІВЕРСІТЭТ АЛЬБАРУТЕНІЯ"

Мінск 2017

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзены Статут прыватнай установы адукацыі "Універсітэт Альбарутенія" (у далейшым -- УА) зацверджаны рашэннем Рады (загадам старшыні?) Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны"

1.2. Заснавальнікам УА з'яўляецца Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны", зарэгістраванае (кім, калі) у Адзіным рэгістры ..... за №....

1.3. Універсітэт ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, нарматыўнымі прававымі актамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і дадзеным Статутам.

1.4. Назва юрыдычнай асобы:
поўная:
на беларускай мове: Прыватная установа адукацыі "Універсітэт Альбарутенія"
на рускай мове: Частное учреждение образования "Университет Альбарутения";

скарочаная:
на беларускай мове: УА.
на рускай мове: УА;

1.5. Месца знаходжання юрыдычнай асобы: 2200.., г. Мінск,
вул. ......., ... .

1.6. Тып установы адукацыі -- установа вышэйшай адукацыі.

1.7. Від установы адукацыі -- універсітэт.

1.8. Універсітэт уваходзіць у сістэму вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

1.9.УА у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублiцы Беларусь з’яўляецца юрыдычнай асобай, у межах уласных паўнамоцтваў можа ад свайго імя заключаць дамовы, набываць і ажыццяўляць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе.

1.10. УА мае самастойны баланс, разліковы і іншыя рахункі ў банку, якія адкрываюцца ў вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку, пячатку і бланкі дакументаў са сваім найменнем, а таксама іншыя неабходныя для ажыццяўлення дзейнасці пячаткі, штампы і бланкі.

## ГЛАВА 2
## МЭТА, ЗАДАЧЫ І ПРАДМЕТ ДЗЕЙНАСЦІ УА

2.1. Мэтай дейнасці УА з'яўляецца прадастаўленне беларускай моладзі магчымасці атрымання вышэйшай адукацыі на беларускай мове, а таксама забеспячэнне кадравага і навуковага патэнцыялу інавацыйнага развіцця

Рэспублікі Беларусь на аснове спалучэння нацыянальных традыцый беларускага народу і перадавога міжнароднага вопыту.

2.2. Задачамі УА з'яўляюцца:

- падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў: бакалаўраў, магістраў і дактароў (кандыдатаў) навук;

- арганізацыя і правядзенне фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў па профілю навучальных спецыяльнасцяў універсітэта;

- задавальненне патрэб асобы ў інтэлектуальным, культурным, фізічным і маральным развіцці ў працэсе атрымання універсітэцкага адукацыі на аснове адзінства адукацыйнага працэсу і навуковых даследаванняў;

- выхаванне навучэнцаў у духу патрыятызму, грамадзянскасці, гуманізму, павагі ідэалаў і традыцый беларускага народу, правоў іншых народаў на карысць чалавека і грамадства;

- забеспячэнне канстытуцыйных правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь на атрыманне вышэйшай адукацыі на беларускай мове;

- інтэграцыя ў еўрапейскую і сусветную адукацыйную прастору шляхам развіцця інтэрнацыяналізацыі і акадэмічнай мабільнасці студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

2.3. Для ажыццяўлення мэты і задач УА ў вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку:

- ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць;

- ажыццяўляе навуковыя праекты;

- ажыццяўляе выдавецкую, інфармацыйную і іншую дзейнасць;

- ажыццяўляе міжнароднае супрацоўніцтва, у тым ліку знешнегандлёвую дзейнасць;

- ажыццяўляе творчае, фінансавае, гаспадарчае і іншые супрацоўніцтва
- з юрыдычнымі і фізічнымі асобамі на дагаворнай аснове;

- фарміруе структуру і штатны расклад прафесарска-выкладчыцкага складу і супрацоўнікаў УА;

- ажыццяўляе падбор, прыём на працу і расстаноўку кадраў, павышэнне
- кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу і супрацоўнікаў УА;

- зацвярджае палажэнні аб структурных падраздзяленнях, якія ўваходзяць у яго склад, а таксама іншыя лакальныя нарматыўныя прававыя акты, што рэгулююць дзейнасць УА і яго структурных падраздзяленняў;

- стварае, рэарганізуе і ліквідуе факультэты, кафедры і іншыя структурныя падраздзяленні УА;

- вызначае кантрольныя лічбы прыёму навучэнцаў;

- вызначае кошт усіх відаў платных работ (паслуг), якія выконвае (аказвае) УА;

- вызначае змест, формы і метады навучання ў УА, арыентаваныя на забеспячэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў;

- распараджаецца інтэлектуальнай уласнасцю, створанай акадэмічнай супольнасцю ў выніку адукацыйнай і навуковай дзейнасці ў УА;

- распараджаецца сродкамі, атрыманымі ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, сродкамі ад адасобленых структурных падраздзяленняў, крэдытамі банкаў, а таксама сродкамі, якія паступілі з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

- здае ў арэнду і прадастаўляе ў карыстанне свабодныя плошчы, памяшканні і іншую маёмасць;

- развівае ўласную матэрыяльна-тэхнічную, сацыяльную базу;
- распрацоўвае змяненні і (або) дапаўненні да Статута УА.

2.4. УА ажыццяўляе наступныя віды ліцэнзуемай дзейнасці:

адукацыйная дзейнасць;
выдавецкая дзейнасць;
Ажыццяўленне ліцэнзуемай дзейнасці пачынаецца з моманту атрымання дазволу ад адпаведнай дзяржаўнай інстанцыі.

2.4. УА у адпаведнасці з Агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь АКРБ 005-2006 (пастанова Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2006 года № 65), ажыццяўляе наступныя віды эканамічнай дзейнасці:

- вышэйшая адукацыя (без паслявузаўскай) (код 80301);
- паслявузаўская адукацыя (код 80302);
- сярэдняя адукацыя (код 802);
- пазашкольнае выхаванне і навучанне (код 80422);
- іншая адукацыя для дарослых і іншая адукацыя, не уключаная ў іншыя
- групоўкі (код 80424);
- навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук (код 73100);
- навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне грамадскіх і гуманітарных навук (код 73200);
- выданне кніг (код 22110);
- выданне часопісаў і перыядычных публікацый (код 22130);
- выданне гуказапісаў (код 22140);

- іншыя віды выдавецкай дзейнасці (код 22150);
- паліграфічная дзейнасць, не ўключаная ў іншыя групоўкі (код 22220); брашуровачна-пераплётная і аддзелачная дзейнасць (код 22230);
- іншая паліграфічная дзейнасць (код 22250);
- капіраванне гуказапісаў (код 22310);
- капіраванне відэазапісаў (код 22320);
- рознічны гандаль кнігамі, газетамі і пісьмова-папяровымі прыладамі
- (код 52470);
- дзейнасць творчых, навукова-тэхнічных і культурна-асветніцкіх грамадскіх аб'яднанняў (код 91120);
- вытворчасць кіна- і відэафільмаў (код 92110);
- распаўсюджванне кіна- і відэафільмаў (код 92120);
- дэманстрацыя кіна- і відэафільмаў (код 92130);
- тэатральная дзейнасць (код 92311);
- канцэртная дзейнасць (код 92312);
- дзейнасць у галіне мастацкай творчасці (код 92313);
- паслугі фільма- і фанатэк (код 92511);
- дзейнасць бібліятэк (код 92512).

2.6. УА рэалізуе:

адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі:

адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі I ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй па спецыяльнасцях (напрамках спецыяльнасцей, спецыялізацыях);

- спецыяльнасць 1-21 01 01 03 "Біблеістыка і хрысціянскае веравучэнне", кваліфікацыя -- Тэолаг-рэлігіязнаўца. Выкладчык этыкі, эстэтыкі, культуралогіі

- спецыяльнасць 1-21 02 01 "Філасофія", кваліфікацыя -- Філосаф. Выкладчык філасофіі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін

- спецыяльнасць 1-21 02 01 02 "Гісторыя філасофіі", кваліфікацыя -- Філосаф. Выкладчык філасофіі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін

- спецыяльнасць 1-21 03 01-01 "Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)", кваліфікацыя -- Гісторык. Выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін

- спецыяльнасць 1-21 03 01-02 "Гісторыя (археалогія), кваліфікацыя -- Гісторык-археолаг. Выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін

- спецыяльнасць 1-21 03 01-03 "Гісторыя (этналогія) , кваліфікацыя -- Гісторык-этнолаг. Выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін

- спецыяльнасць 1-21 04 01-01 03 "Сусветная і айчынная мастацкая культура", кваліфікацыя -- Культуролаг-даследчык. Выкладчык

- спецыяльнасць 1-21 04 01-01 04 "Амерыканістыка і англійская мова", кваліфікацыя -- Культуролаг-даследчык. Выкладчык.
- спецыяльнасць 1-21 04 01-01 08 "Галіцыстыка і французская мова ", кваліфікацыя -- Культуролаг-даследчык. Выкладчык.
- спецыяльнасць 1-21 04 01-01 09 "Англістыка і англійская мова ", кваліфікацыя -- Культуролаг-даследчык. Выкладчык.

- спецыяльнасць 1-21 04 01-01 05 "Германістыка і нямецкая мова", кваліфікацыя -- Культуролаг-даследчык. Выкладчык.

- спецыяльнасць 1-21 04 01-01 10 "Паланістыка і польская мова", кваліфікацыя -- Культуролаг-даследчык. Выкладчык.

- спецыяльнасць 1-21 04 01-02 02 " Менеджмент міжнародных культурных сувязей", кваліфікацыя -- Культуролаг-менеджэр

- спецыяльнасць 1-21 04 02-05 02 "Тэорыя і гісторыя мастацтваў", кваліфікацыя -- Мастацтвазнаўца. Выкладчык

- спецыяльнасць 1-17 01 04-01"Рэжысура кіно і тэлебачання (кіно)", кваліфікацыя -- Рэжысёр. Выкладчык.
- спецыяльнасць 1-17 01 03-01 "Кінацелеаператарства (кінааператарства)", кваліфікацыя -- кінааператар.

- спецыяльнасць 1-17 01 04-03 "Рэжысура кіно і тэлебачання (гукарэжысура)", кваліфікацыя -- Гукарэжысёр. Выкладчык.
- спецыяльнасць 1-17 01 05 " Рэжысура свят (па напрамках)", кваліфікацыя -- Рэжысёр. Выкладчык.
- спецыяльнасць 1-19 01 01 "Дызайн (па напрамках)", кваліфікацыя -- Дызайнер.
- спецыяльнасць 1-19 01 01-06 "Дызайн (віртуальнага асяроддзя)", кваліфікацыя -- Дызайнер.

- спецыяльнасць 1-21 05 01-01"Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)", кваліфікацыя -- Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік.
- спецыяльнасць 1-21 05 05 "Класічная філалогія", кваліфікацыя -- Філолаг. Выкладчык. Выкладчык класічных моў, антычнай літаратуры і сучаснага замежнай мовы (з указаннем мовы). Перакладчык.
- спецыяльнасць 1-21 05 06 "Рамана-германская філалогія", кваліфікацыя -- Філолаг. Выкладчык. Выкладчык класічных моў, антычнай літаратуры і сучаснага замежнай мовы (з указаннем мовы). Перакладчык.
- спецыяльнасць 1-21 05 07 "Усходняя філалогія", кваліфікацыя -- Філолаг. Выкладчык. Выкладчык класічных моў, антычнай літаратуры і сучаснага замежнай мовы (з указаннем мовы). Перакладчык.

- спецыяльнасць 1-21 06 01-01 04 "Беларуская мова як замежная", кваліфікацыя -- Лінгвіст. Выкладчык дзвюх замежных моў (з указаннем моў).
- спецыяльнасць 1-23 01 04 "Псіхалогія", кваліфікацыя -- Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі
- спецыяльнасць 1-23 01 05 "Сацыялогія" , кваліфікацыя -- Сацыёлаг. Выкладчык сацыялогіі і сацыяльна-палітычных дысцыплін
- спецыяльнасць 1-23 01 07-01 "Інфармацыя і камунікацыя (тэхналогіі камунікацыі)", кваліфікацыя -- Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі. журналіст
- спецыяльнасць 1-23 01 08 " Журналістыка (па напрамках)", кваліфікацыя -- Журналіст
- спецыяльнасць 1-23 01 10-01 "Літаратурная работа (творчасць)", кваліфікацыя -- Літаратурны работнік.
- спецыяльнасць 1-23 01 06 "Паліталогія (па напрамках)", кваліфікацыя -- Палітолаг.
- спецыяльнасць 1-23 01 12-04 "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм)", кваліфікацыя -- Менеджэр па культурнай спадчыне і турызме.
- спецыяльнасць 1-24 01 02 "Правазнаўства", кваліфікацыя -- Юрыст.
- спецыяльнасць 1-24 01 01 "Міжнароднае права", кваліфікацыя -- Юрыст-міжнароднік з веданнем замежных моў (з указаннем моў зносін).
- спецыяльнасць 1-25 01 01 "Эканамічная тэорыя", кваліфікацыя -- Эканаміст. Выкладчык эканамічных дысцыплін.
- спецыяльнасць 1-25 01 03 02 "Знешнегандлёвая і камерцыйная дзейнасць ", кваліфікацыя -- Эканаміст
- спецыяльнасць 1-26 02 01 "Бізнес-адміністраванне", кваліфікацыя -- Менеджэр-эканаміст
- спецыяльнасць 1-26 02 03 "Маркетынг", кваліфікацыя -- Маркетолаг-эканаміст
- спецыяльнасць 1-26 02 05 "Лагістыка", кваліфікацыя -- Лагістык-эканаміст.
- спецыяльнасць 1-26 03 01 "Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі", кваліфікацыя -- Менеджэр-эканаміст інфармацыйных сістэм.
- спецыяльнасць 1-89 01 01 "Турызм і гасціннасць", кваліфікацыя -- Спецыяліст у сферы турызму і гасціннасці.

адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі II ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай працы і забяспечвае атрыманне ступені магістра, па спецыяльнасцях:

- спецыяльнасць 1-21 80 01 "Рэлігіязнаўства, філасофская антрапалогія, філасофія культуры", кваліфікацыя -- Магістр (па галінах навук): філасофскіх, гістарычных.
- спецыяльнасць 1-21 80 02 "Славянскія мовы", кваліфікацыя -- Магістр філалагічных навук
- спецыяльнасць 1-21 80 03 "Германскія мовы", кваліфікацыя -- Магістр філалагічных навук
- спецыяльнасць 1-21 80 10 "Літаратуразнаўства", кваліфікацыя -- Магістр філалагічных навук
- спецыяльнасць 1-21 80 12 "Філасофія", кваліфікацыя -- Магістр філасофскіх навук

- спецыяльнасць 1-21 80 13 "Культуралогія", кваліфікацыя -- Магістр культуралогіі
- спецыяльнасць 1-21 80 14 "Мастацтвазнаўства", кваліфікацыя -- Магістр мастацтвазнаўства
- спецыяльнасць 1-21 80 15 "Усеагульная гісторыя", кваліфікацыя -- Магістр гістарычных навук
- спецыяльнасць 1-21 80 16 "Айчынная гісторыя", кваліфікацыя --
- спецыяльнасць "", кваліфікацыя -- Магістр гістарычных навук
- спецыяльнасць 1-21 80 17 "Археалогія", кваліфікацыя -- Магістр гістарычных навук
- спецыяльнасць 1-21 80 18 "Этнаграфія, этналогія і антрапалогія", кваліфікацыя -- Магістр гістарычных навук
- спецыяльнасць 1-23 80 03 "Псіхалогія", кваліфікацыя -- Магістр псіхалагічных навук
- спецыяльнасць 1-23 80 04 "Сацыялогія", кваліфікацыя -- Магістр сацыялагічных навук
- спецыяльнасць 1-23 80 05 "Журналістыка", кваліфікацыя -- Магістр філалагічных навук
- спецыяльнасць 1-24 80 01"Права", кваліфікацыя -- Магістр юрыдычных навук
- спецыяльнасць 1-25 81 01 "Міжнародная эканоміка і гандлёвая палітыка", кваліфікацыя -- Магістр эканомікі.

адукацыйныя праграмы аспірантуры, якая забяспечвае атрыманне навуковай кваліфікацыі «Даследчык», па спецыяльнасцях;

- спецыяльнасць 07.00.02 "Айчынныя гісторыя";
- спецыяльнасць 10.01.01 "Беларуская літаратура";
- спецыяльнасць 10.02.01 "Беларуская мова";
- спецыяльнасць 12.00.10 "Міжнароднае права. Еўрапейскае права".

адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых па профілю УА;
адукацыйныя праграмы сярэдняй адукацыі з паглыбленым вывучэннем дысцыплін па профілю УА.

2.7. Стварэнне і дзейнасць палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць палітычныя мэты, а таксама стварэнне і ананімная або іншая супярэчная заканадаўству Рэспублікі Беларусь дзейнасць рэлігійных арганізацый у УА не дапускаецца.

## ГЛАВА 3
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА І ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСАЎ

3.1. Навучанне, выхаванне, справаводства і іншыя формы актыўнасці ва УА ажыццяўляюцца на беларускай мове. Іншыя мовы выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбнага працэсу і навуковых даследаванняў.

3.2. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу з'яўляюцца:

пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі:
- студэнты,

- законныя прадстаўнікі непаўналетніх студэнтаў,
- педагагічныя работнікі, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкі склад.

пры рэалізацыі адукацыйных праграм пасляўніверсітэцкай адукацыі:

- аспіранты,
- саіскальнікі,
- педагагічныя работнікі, у тым ліку навуковыя кіраўнікі, навуковыя кансультанты.

пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых:

- слухачы,
- стажоры,
- законныя прадстаўнікі непаўналетніх слухачоў,
- педагагічныя работнікі, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкі склад.

пры рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй адукацыі:

- ліцэісты,
- законныя прадстаўнікі непаўналетніх ліцэістаў,
- педагагічныя работнікі, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкі склад.

3.3. Навучэнцы (студэнты, магістранты, аспіранты, суіскальнікі, слухачы і стажоры, ліцэісты) УА маюць права на:

атрыманне адукацыі адпаведнага ўзроўню ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі;

навучанне па індывідуальных вучэбных планах у межах зместу адукацыйнай праграмы;

удзел у кіраванні УА;

стварэнне органаў студэнцкага самакіравання, абранне ў іх склад і ўдзел у іх рабоце, аб'яднанне ў прафесійныя саюзы, моладзевыя і іншыя грамадскія аб'яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь;

ахову жыцця і здароўя падчас адукацыйнага працэса, бяспечныя ўмовы навучання;

водпускі:

акадэмічныя(па медыцынскіх паказаннях, у сувязі з
призывам на службу ў рэзерве, альбо па іншых уважлівых прычынах);
па догляду за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў;
для праходжання ваеннай службы;

канікулы -- планавыя перапынкі для адпачынку пры вочнай форме атрымання вышэйшай адукацыі;

атрыманне платных паслуг у сферы адукацыі;

абскарджанне рашэнняў адміністрацыі і
службовых асоб УА ў парадку, усталяваным заканадаўствам
Рэспублікі Беларусь і Статутам універсітэта;

абарону сваіх правоў і законных інтарэсаў;

адтэрміноўку ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве на час навучання, вызваленне ад праходжання вайсковых і спецыяльных збораў ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

карыстанне маёмасцю універсітэта, неабходнай для забеспячэння
навучальнага працэсу і навуковых даследаванняў.

3.4. Навучэнцы УА абавязаны:
добрасумленна і адказна адносіцца да асваення зместу адукацыйных
праграм і праграм выхавання;
выконваць у вызначаныя тэрміны патрабаванні вучэбных планаў і
вучэбных праграм;

выконваць адпаведныя правілы статуту, правілы ўнутранага распарадку, загады і распараджэнні рэктара, прарэктараў, дэканаў, загадчыкаў кафедраў;

3.5. Навучэнцы могуць мець іншыя правы і несці іншыя абавязкі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і статутам УА.

3.6. Педагагічныя работнікі, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкі склад
маюць права на:

забеспячэнне ўмоў для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці;

карыстанне маёмасцю УА ў адукацыйных, навуковых і выхаваўчых мэтах;

удзел у кіраванні УА, выбранне ў склад кіруючых органаў;

павышэнне кваліфікацыі;

аб'яднанне ў прафесійныя саюзы, іншыя грамадскія аб'яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь;

маральнае і матэрыяльнае заахвочванне за поспехі ў педагагічнай дзейнасці;

3.7. Педагагічныя работнікі, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкі склад могуць мець іншыя правы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3.8. Педагагічныя работнікі, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкі склад абавязаны:
весці на высокім прафесійным узроўні вучэбную, выхаваўчую і

вучэбна-метадычную работу;

праводзіць навукова-даследчую і метадычную дзейнасць у адпаведнай галіне навукі;

забяспечваць пастаяннае ўдасканаленне сваіх прафесійных ведаў і педагагічнага майстэрства, праходзіць атэстацыю;

3.9. Іншыя абавязкі педагагічных работнікаў УА вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і службовымі інструкцыямі.

3.10. Вакантныя пасады прафесарска-выкладчыцкага (за выключэннем выкладчыка-стажора) і навуковага складу замяшчаюцца па конкурсу, з далейшым заключэннем кантракта, вызначаны рэктарам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь

3.11. Працягласць навучання ва УА складае 4 гады на першай ступені вышэйшай адукацыі (бакалаўрыят) і 1,5 -- 2 гады на другой ступень вышэйшай адукацыі (магістратура). Працягласць навучання на праграмах пасляўніверсітэцкай адукацыі складае не менш 3 гадоў. Працягласць навучання на праграмах адукацыі для дарослых вызначаецца ў адпаведнасці са зместам праграмы навучання. Працягласць навучання на праграмах сярэдняй адукацыі складае ад 4 гадоў і да 1 года.

3.12. Першая ступень вышэйшай адукацыі забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і завяршаецца прысваеннем кваліфікацыі і выдачай дыплома аб вышэйшай адукацыі. Падрыхтоўку на першай ступені могуць атрымліваць асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю або сярэднюю спецыяльную адукацыю, а таксама асобы, якія жадаюць атрымаць другую і далейшую вышэйшую адукацыю.

3.13. Другая ступень вышэйшай адукацыі(магістратура) забяспечвае паглыбленную падрыхтоўку спецыяліста, фарміраванне ведаў і навыкаў навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы з прысваеннем ступені магістра па адпаведнай спецыяльнасці.

3.14. Падрыхтоўка на першай і другой ступенях вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца ў вочнай (стацыянарнай), дыстанцыйнай і змешанай формах атрымання адукацыі.

3.15. Паслявузаўская адукацыя накіраваная на развіццё асобы аспіранта, суіскальніка і рэалізацыі іх інтэлектуальнага і творчага патэнцыяла, фарміравання прафесійных навыкаў арганізацыі і правядзення навуковых даследаванняў з прысваеннем навуковай кваліфікацыі “Даследчык”.

Паслявузаўская адукацыя ва УА ўключае ў сябе ступень аспірантуры.

3.16. Прыём на навучанне ва УА ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі прыёму, зацверджанымі органамі кіравання універсітэту. Для ажыццяўлення прыёму ствараецца Прыемная камісія, якая ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб прыемнай камісіі, зацверджаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Белаурсь.

3.17. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі арганізуецца па навучальным гадам. Навучальны год падзяляецца на семестры, якія завяршаюцца экзаменацыйнымі сесіямі. Пачатак заняткаў -- 1 верасня, заканчэнне -- 30 чэрвеня. Калі паказаныя даты прыходзяцца на непрацоўны дзень, то вучэбныя заняткі ў вучэбным годзе пачынаюцца ў наступны і заканчваюцца ў папярэдні працоўны дзень.

3.18. Заняткі ва УА праводзяцца ў адпаведнасці з раскладам, які зацвярджаецца рэктарам. Канікулы прадстаўляюцца двойчы ў год, іх агульная працягласць складае не менш дзесяці каляндарных тыдняў.

3.19. Парадак арганізацыі вучэбнай і вытворчай практыкі вызначаецца адпаведнымі нарматыўнымі актамі Рэспублікі Беларусь.

3.20. Пачатак вучэбных заняткаў адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых вызначаецца тэрмінам камплектавання вучэбных груп. Пры гэтым вучэбныя заняткі пачынаюцца не пазней за тры месяцы пасля даты заключэння адпаведнага дагавора.
3.21. Ва УА прынятая шкала адзнак, якая адпавядае з дзеючаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь. Бягучая атэстацыя праводзіцца ў формах, прадугледжаных вучэбнымі планамі і вучэбнымі праграмамі.

3.22. Выніковая атэстацыя на першай ступені вышэйшай адукацыі праводзіцца ў форме дзяржаўнага экзамену або дзяржаўнага экзамену і абароны дыпломнай работы.
Выніковая атэстацыя на другой ступені вышэйшай адукацыі праводзіцца ў форме абароны магістэрскай дысертацыі.
Выніковая атэстацыя на праграмах паслявузаўскай адукацыі праводзіцца ў форме абароны дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата навук.
Парадак выніковай атэстацыі па праграмах адукацыі для дарослых вызначаецца Рэктарам УА.
3.23. Выхаванне студэнтаў, слухачоў, магістрантаў, аспірантаў ва УА накіраваная на фарміраванне гарманічнай, усебакова развітай, маральнай, сацыяльна актыўнай і творчай асобы, фарміраванне патрыятызму, актыўнай грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў.
3.24. Адукацыйны працэс рэгулюецца Статутам УА, Правіламі ўнутранага распарадку, загадамі і распараджэннямі рэктара.

## ГЛАВА 4
## АРГАНІЗАЦЫЯ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ І ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

4.1. УА ажыццяўляе навуковую і інавацыйную дзейнасць у адпаведнасці з профілем падрыхтоўкі спецыялістаў і прыярытэтнымі кірункамі дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі. Парадак ажыццяўлення навуковай і інавацыйнай дзейнасці ўсталёўваецца адпаведным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, статутам і рашэннямі кіроўных органаў універсітэта.
4.2. Асноўным структурным падраздзяленнем, якое ажыццяўляе адукацыйную, творчую і навуковую дзейнасць, а таксама вучэбна-метадычную работу па

адной, альбо некалькім роднасным спецыяльнасцям, альбо вучэбным дысцыплінам, з'яўляецца кафедра.
Арганізацыйна-адміністратыўным структурным падраздзяленнем, якое забяспечвае адукацыйную і навуковую дзейнасць, а таксама вучэбна-метадычную работу ў рамках вызначанага профілю (напрамка адукацыі, спецыяльнасцяў) падрыхтоўкі спецыялістаў, з’яўляецца факультэт; у яго склад уваходзяць кафедры.
4.3. Навукова-даследчая, метадычная і творчая дзейнасць кафедраў ажыццяўляецца на падставе гадавых і перспектыўных планаў, якія зацвярджае кіруючыя органы УА.
4.4. Арганізацыю і кантроль навукова-даследчай, метадычнай і творчую дзейнасці ва УА ажыццяўляе прарэктар па навуковай рабоце.

## ГЛАВА 5
## СТРУКТУРА УНІВЕРСІТЭТА

5.1. У склад УА ўваходзяць наступныя структурныя падраздзяленні: факультэты, кафедры, лабараторыі, аддзелы, ліцэй, інстытуты, рэктарат, Кіроўная Рада і Акадэмічная Рада.

5.2. Прававы статус і функцыі падраздзяленняў вызначаюцца ў адпаведных рэгламентах дзейнасці падраздзяленняў, зацверджаных кіроўнымі органамі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

5.3. УА можа ствараць, а таксама ліквідаваць філіялы, прадстаўніцтвы і іншыя адасобленыя падраздзяленні, у тым ліку са статусам юрыдычнай асобы, ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 6.
## КІРАЎНІЦТВА УНІВЕРСІТЭТАМ

6.1. Кіраўніцтва УА ажыццяўляюць наступныя органы:
Кіроўная Рада;
Акадэмічная Рада;
Рэктар
6.2. Кіроўная Рада з'яўляецца найвышэйшай структурай кіравання УА.

У склад Кіроўнай Рады ўваходзіць 11 чалавек, у тым ліку: Заснавальнік ці прадстаўнік арганізацыі-заснавальніка, Рэктар, 5 прадстаўнікоў акадэмічнай супольнасці, 4 асобы ці прадстаўнікі арганізацый, якія ажыццяўляюць непасрэдную арганізацыйную ці/і фінансавую дапамогу УА.

Рэктар не мае права займаць пасаду старшыні Кіроўнай Рады.
Права запрашэння асоб ці прадстаўнікоў арганізацый, якія ажыццяўляюць непасрэдную арганізацыйную ці/і фінансавую дапамогу УА у склад Кіроўнай Радай мае Заснавальнік універсітэта.

6.3. Кіроўная Рада мае наступныя паўнамоцтвы:
ухваляе кандыдатуру на пазіцыю Рэктара, для зацвярджэння Міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь;
распрацоўвае і зацвярджае перспектыўны план развіцця УА;

зацвярджае і кантралюе выкананне бюджэту УА;
прымае рашэнні аб стварэнні ці ліквідацыі структурных падраздзяленняў УА;
зацвярджае правілы і кантрольныя лічбы набору, памер аплаты за навучанне;
зацвярджае структуру і штатны расклад УА;
уносіць змены ў Статут УА.

6.3. Дзейнасць Кіроўнай Рады ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Рэгламентам, зацверджаным Заснавальнікам УА.

6.4. Акадэмічная Рада УА з'яўляецца галоўным органам акадэмічнага самакіравання.
Колькасны склад Акадэмічнай Рады вызначаецца Рэгламентам, зацверджаным Кіроўнай Радай універсітэту.
6.5. У склад Акадэмічнай Рады уваходзяць:
прадстаўнікі прафесарска-выкладчыцкага складу універсітэта, якіх выбіраюць прамым і таемным галасаваннем;
прадстаўнікі навучэнцаў, якіх выбіраюць прамым і таемным галасаваннем;
прадстаўнікі навучэнцаў складаюць не менш 25 % складу Акадэмічнай Рады;
асобы, грамадскія дзеячы і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, зацікаўленых ва ўдзеле ў кіраванні УА, квота якіх зацвярджаецца Рэгламентам Кіроўнай Рады.
Рэктар УА (па пасадзе).
Рэктар УА не можа быць Старшынёй Акадэмічнай Рады.
6.6. Акадэмічная Рада:
выбірае прамым і таемным галасаваннем кандыдатуру на пасаду Рэктара, для ухвалення Кіроўнай Радай;
выбірае прамым і таемным галасаваннем прадстаўнікоў акадэмічнай супольнасці ў Кіроўнай Радзе універсітэта. Пры гэтым прадстаўнікі навучэнцаў павінны складаць не меней 2 з 5 прадстаўнікоў акадэмічнай супольнасці;
зацвярджае вынікі конкурсаў на замяшчэнне вакантных пасад прафесарска-выкладчыцкага складу універсітэта;
зацвярджае вынікі конкурсаў на замяшчэнне вакантных пасад кіраўнікоў акадэмічных структурных падраздзяленняў УА: дэканаў, загадчыкаў кафедр, кіраўнікоў лабараторый і г. д.;
распрацоўвае і зацвярджае рэгламенты дзейнасці акадэмічных структурных падраздзяленняў УА;
прымае рашэнні адносна прысуджэння званняў "Ганаровага прафесара УА" і "Ганаровага доктара УА";
прымае іншыя рашэнні ў акадэмічнай сферы ў адпаведнасці з Рэгламентам дзейнасці Акадэмічнай Рады.

6.7. Рэктар у межах сваіх паўнамоцтваў ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва ўсёй дзейнасцю УА.
6.8. Тэрмін знаходжання на пасадзе Рэктара складае 5 год. Адна і тая ж асоба не можа займаць пасаду Рэктара болей двух тэрмінаў.
6.9. Рэктар УА:
дзейнічае ад імя УА без даверанасці і нясе адказнасць за вынікі яго

дзейнасці;
выдае загады і распараджэнні, абавязковыя для выканання ўсімі работнікамі і навучэнцамі УА;
заключае дамовы;
выдае даверанасці;
адкрывае рахункі ў банках у межах сваёй кампетэнцыі;
кіруе работай рэктарата;
забяспечвае выкананне Статута УА;
прызначае сваім загадам на пасады і вызваляе ад пасад прарэктараў, кіраўнікоў структурных падраздзяленняў адміністрацыі УА;
ажыццяўляе прыём і звальненне работнікаў УА;
прымяняе да супрацоўнікаў і навучэнцаў меры заахвочвання і накладае дысцыплінарныя спагнанні.
у вызначаным парадку дэлегуе частку сваіх паўнамоцтваў прарэктарам;

6.10. У час адсутнасці рэктара яго абавязкі выконвае першы прарэктар.

6.11. Рэгламент дзейнасці Рэктара і адміністрацыі УА складаецца і зацвярджаецца Кіроўнай Радай універсітэта.

## ГЛАВА 7.
## ФІНАНСАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ І МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЯ БАЗА

7.1. Крыніцамі фінансавання УА з'яўляюцца:
сродкі, атрыманыя ад дзейнасці, якая прыносіць прыбытак;
бязвыплатная (спонсарская) дапамога юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам;
сродкі рэспубліканскага бюджэту.

7.2. УА ажыццяўляе дзейнасць, якая прыносіць прыбытак ў адпаведнасці з заканадаўствам.

7.3. У мэтах забеспячэння дзейнасці, прадугледжанай Статутам, УА ажыццяўляе аператыўнае кіраванне будынкамі, збудаваннямі, маёмаснымі комплексамі, абсталяваннем, а таксама іншай неабходнай маёмасцю спажывецкага, сацыяльнага, культурнага і іншага прызначэння, калі іншае не вызначана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 8.
## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

8.1 Міжнароднае супрацоўніцтва з'яўляецца адным з прыярытэтаў дзейнасці УА.

8.2. Міжнароднае супрацоўніцтва ажыццяўляецца на прынцыпах незалежнасці, роўнасці, узаемнай выгады, узаемнай павагі і не павінна наносіць шкоду нацыянальнаму суверэнітэту, нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь і інтарэсам асобы, грамадства і дзяржавы.

8.3. Міжнароднае супрацоўніцтва ажыццяўляецца на падставе міжнародных дамоў Рэспублікі Беларусь, дамоў, дагавораў, пагадненняў, якія заключаюцца паміж УА і арганізацыяй замежнай дзяржавы (міжнароднай арганізацыяй, замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь), міжнародных і нацыянальных праектаў і праграм у сферах адукацыі і культуры.

8.4. УА ажыццяўляе міжнароднае супрацоўніцтва шляхам:

удзелу ў праграмах двухбаковага і шматбаковага абмену навучэнцамі, супрацоўнікамі;
запрашэння супрацоўнікаў і спецыялістаў замежных дзяржаў для ўдзелу ў педагагічнай, навуковай, творчай рабоце;
накіравання супрацоўнікаў у замежныя ўстановы адукацыі і навуковыя арганізацыі для выканання педагагічнай, навуковай і творчай работы;
правядзення сумесна з міжнароднымі арганізацыямі, замежнымі фізічнымі і юрыдычнымі асобамі, або па іх заказу, навуковых даследаванняў і распрацовак, рэалізацыі культурных, сацыяльна арыентаваных, адукацыйных праектаў, у тым ліку ў галіне павышэння кваліфікацыі;
накіравання навучэнцаў і педагагічных работнікаў УА на навучанне (стажыроўку) за мяжу;
удзелу ў міжнародных кангрэсах, канферэнцыях, сімпозіумах, рабоце міжнародных арганізацый і асацыяцый.

8.5. Навучанне, падрыхтоўка, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі грамадзян Рэспублікі Беларусь у установы вышэйшай адукацыі іншых дзяржаў ажыццяўляюцца на аснове міжнародных дамоў, дзеючых для Рэспублікі Беларусь, дамоў, якія заключаны УА (грамадзянінам Рэспублікі Беларусь) з міжнароднымі арганізацыямі, замежнымі фізічнымі і юрыдычнымі асобамі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

8.6. УА мае права ў парадку, усталяваным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, выступаць заснавальнікам міжнародных арганізацый і ўступаць у такія арганізацыі, прадстаўляць інтарэсы УА ў міжнародных арганізацыях, а таксама ствараць свае філіялы і прадстаўніцтвы за мяжой.

82. УА ажыццяўляе ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб знешнегандлёвай дзейнасці і Статутам знешнегандлёвую дзейнасць, накіраваную на выкананне задач вышэйшай адукацыі, а таксама на развіццё міжнародных кантактаў.

83. Міжнародную дзейнасць УА арганізуе і кантралюе прарэктар па навуковай рабоце.

## ГЛАВА 9.
## СІМВАЛЫ І РЫТУАЛЫ УНІВЕРСІТЭТА

9.1. УА мае ўласныя герб, сцяг, гімн, якія зацверджаны ва ўстаноўленым парадку.

9.2. УА мае ганаровыя званні "Ганаровы прафесар Універсітэта Альбарутенія" і "Ганаровы доктар Універсітэта Альбарутенія".

9.3. Прадак прысуджэння ганаровых званняў вызначае Акадэмічная Рада УА.

9.4. УА мае ўласныя рытуалы, у тым ліку пачатку і завяршэння навучальнага году, пасвячэння ў студэнты, пасяджэння Акадэмічнай Рады і г. д.

## ГЛАВА 10
## РЭАРГАНІЗАЦЫЯ І ЛІКВІДАЦЫЯ УА

10.1. Рэарганізацыя і ліквідацыя УА ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з адпаведным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.